Нефармат

МАЕ ЛЮБІМЫЯ «ВЁСКІ» І ІХ ЖЫХАРЫ

Сёння крыху ў іншым фармаце вярнуся да сваёй рубрыкі «Вёскі, якія знікаюць». Пра многіх жыхароў маленькіх, нярэдка, зусім аддаленых вёсак удалося расказаць за два гады. Бывае, едзеш са старшынёй сельскага Савета многа кіламетраў лесам, здаецца, дарога вось-вось скончыцца, і ніякіх прыкмет жыцця... Але там згубілася вёска, там жывуць людзі, бывае, зусім адзін чалавек, апошні жыхар свайго населенага пункта. За гэты час я нярэдка здзіўлялася, спачувала, захаплялася і, галоўнае, палюбіла многіх сваіх герояў.

А натхніла мяне на праект Марыя Андрэеўна Панько з вёскі з сімвалічнай назвай — Глыбокі Кут. 84-гадовая жанчына жыве адна ў глыбіні Белавежскай пушчы. Кожны дзень да яе на падворак заходзяць дзікія звяры, а аднойчы бабульку вельмі напужаў зубр, які пастукаў рагамі ў дзверы. Часам сядзіць гаспадынька каля акна з кубкам гарбаты, а ў акно нахабна зазірае казіная морда. Тады яна бярэ кій, лёгенька стукае ў шыбу, і пужлівая козачка кідаецца наўцёкі. А яшчэ там часта чуецца стралянiна, побач раскінуліся паляўнічыя ўгоддзі Нацыянальнага парка. І аўтакрама да яе прыходзіць, толькі не спажыўтаварыства, а таго ж Нацыянальнага парка. Так і жыве гэтая прыгожая ўсмешлівая бабуля, якую некалі малым дзіцем разам з бацькамі немцы выгналі са свайго дома. Акупанты вызвалялі пушчу ад жыхароў.

Колькі трагічнага, а заадно кур'ёзнага, незвычайнага ў гісторыі асобных вёсак — пра некаторыя хоць ты кіно здымай! Ну, напрыклад, пра Какорыцу Драгічынскага раёна. Людзей аднойчы пазбаўлялі волі па жэрабі... Яны перавярнулі машыну НКУС, калі супрацоўнікі адпаведнага ведамства ехалі прыстрашыць неахвотных уступаць у калгасы. А потым ніхто нікога не выдаў. Дык вось ім сказалі: выбірайце, хто будзе сядзець. Ну і выбралі. Праўда, далі невялікія тэрміны, жанчыны атрымалі вольнае пасяленне, але ж за тысячы кіламетраў ад дому.

Слухаеш аповеды гэтых людзей, і пачынаеш неяк па-новаму ўсведамляць гісторыю нашай краіны, бо кожная вёска часцінка гэтай гісторыі, яе маленькая старонка. Ды і не толькі гісторыі, але і сучаснасці. Вось, скажам, Рыцец — крайні паўднёвы пункт Брэсцкага раёна — апынуўся за лініяй дэмаркацыі дзяржаўнай мяжы з Украінай. Вёска цяпер нібы завісла паміж дзяржавамі. І пяцёра яе апошніх жыхароў вельмі непакоіліся, нехта пусціў чутку, што будуць адсяляць. Адсяляць іх, як высветлілася, ніхто не збіраўся. Але ж вельмі складана жыць, калі ты аказаўся на мяжы. Пастаянныя праверкі памежных нарадаў, нават калі дзеці едуць на Вялікдзень да бацькоў, калі людзі вяртаюцца з пахавання аднавяскоўца. Той матэрыял пра Рыцец называўся «Мяжа, што прайшла цераз сэрца».

Што датычыцца памежжа, то гэта асаблівая тэма для мясцовых жыхароў. Людзі прызвычаіліся цягам жыцця сустракацца з суседзямі, многія пераражаніліся. А потым ім сказалі, што за мяжу, калі ласка, толькі праз афіцыйны пераход. Але ж яны, вядома, хадзілі адно да аднаго паціху, пакуль не ўзвялі агароджы. І нават калі ўзвялі. У адным сельсавеце расказвалі, як прапаў жыхар такой маланаселенай вёскі. Жыхар, варта адзначыць, непрацуючы, злоўжываў алкаголем. Некаторыя са знаёмых небаракі казалі міліцыянерам, што яго варта пашукаць з таго боку мяжы — каля ўкраінскага магазіна. Там яго і знайшлі праз тыдзень, каля сцяны крамы. Растлумачыць, як пераадолеў мяжу, ён не змог альбо не захацеў. Не пісала пра гэты выпадак у матэрыяле пра вёску па просьбе тых, хто расказаў. А цяпер без указання раёна і населенага пункта, думаю, можна. Як і яшчэ пра адзін. Тут ужо сам герой расказваў пра свае нядаўнія прыгоды. Уладзімір Васілевіч, назавём яго так, апошнія тры гады жыве адзін. А памежная зона пачынаецца ледзь не за яго хлявом.

— І вось аднойчы, — расказвае ён — туды, у бок мяжы сталі грузавыя ваенныя машыны хадзіць адна за адной. А мы з суседам сядзелі, дзень пажылых людзей адзначалі. Ну і захацелася ж паглядзець, што там робіцца. Чарка прыдала рашучасці, і пайшоў я ў бок таго знака, які забараняе грамадзянскім асобам набліжацца да аб'екта. Іду, нікога няма, а тут, як з-пад зямлі салдацік з аўтаматам: «Рукі ўгору!» Кінулі мяне на зямлю, тварам уніз. А я паднімаю галаву і з'едліва так кажу: «Ну-ну, кліч начальства, можа табе ордэн дадуць, скажы, самога Бандэру затрымаў». Потым пасадзілі на бервяно і пратрымалі тры гадзіны, пакуль камандзір іхні не прыехаў.

— Вось што бывае з дзядамі, калі яны застаюцца без пільнага нагляду сваіх палавін, — пракаментавала няўдалы паход на мяжу суседка Уладзіміра Васілевіча.

Адзінокія ж бабулькі, як правіла, прыгод на сваю галаву не шукаюць. Наадварот, не раз даводзілася дзівіцца, які парадак у хаце могуць падтрымліваць, а на дзявятым, а то і дзясятым дзясятку яшчэ займаюцца рукадзеллем. Адна такая, 92-гадовая, казала мне: «Ты ж глядзі, так мяне здымай, каб я прыгожай, а не абыякой атрымалася!»

Яшчэ мне вельмі запомнілася Любоў Максімаўна Жабрун з Пружаншчыны. Яна адна ў вёсцы. Пакуль не згаджаецца пераязджаць у горад да дзяцей. Растлумачыла, чаму. Бо дом гэты будаваў яе муж сваімі рукамі, пры гэтым яны гаравалі, ва ўсім сабе адмаўлялі. Дык яна лічыць здрадай яго памяці, калі пераедзе, пакіне дом. Любоў Пятроўна Кузьміч з Пералум'я Жабінкаўскага раёна таксама не забываецца. Яе старэйшы сын інвалід з дзяцінства. Раней такіх не бралі ў школу, як гэта робяць цяпер. Дык ён па нашай газеце чытаць навучыўся, першыя літара яго была «З».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.36	17.11	8.35
Віцебск —	8.31	16.55	8.24
Магілёў —	8.27	17.01	8.34
Гомель —	8.17	17.04	8.47
Гродна —	8.51	17.27	8.36
Брэст —	8.45	17.34	8.49

Месяц

Першая квадра ў 17.54. Месяц у сузор'і Вадаліва.

Імяніны

Пр. *Канстанціна.*
К. *Амеліі, Альберта, Артура, Леапольда.*

Фота Андрэя САЗОНАВА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

15 ЛІСТАПАДА

1925 год — у Мінску ў эфір выйшла першая перадача беларускага радыё. Радыёстанцыя РВ-10 імя Саўнаркама БССР стала трансліраваць перадачы ў радыусе да 300 км працягласцю 30 хвілін у суткі. У Беларусі фарміравалася радыёперадавальная сетка.

1947 год — нарадзіўся Анатоль Іванавіч Ярмоленка, эстрадны спявак, народны артыст Беларусі. З 1974 года мастацкі кіраўнік і вядучы саліст творчага аб'яднання «Студыя «Сябры». Першы выканаўца многіх папулярных песень беларускіх і расійскіх кампазітараў. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

1953 год — нарадзіўся Аляксандр Рымавіч Цыганоў, беларускі вучоны ў галіне хіміі, акадэмік НАН Беларусі , член-карэспандэнт Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь (1999—2002), доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар. Аўтар больш як 800 навуковых прац, прысвечаных распрацоўцы экспрэсных метадаў і методык аналізу якасці сельскагаспадарчай прадукцыі і аб'ектаў навакольнага асяроддзя, аграхімічных прыёмаў атрымання экалагічна чыстай прадукцыі раслінаводства. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

1962 год — у Мінску на 1-м з'ездзе работнікаў кінематаграфіі Беларусі заснаваны Саюз кінематаграфістаў Беларусі (з 1999 года — Беларускі саюз кінематаграфістаў). Галоўныя задачы арганізацыі: захаванне і развіццё найлепшых традыцый нацыянальнага кіно, садзейнічанне стварэнню высокамастацкіх тэле- і відэафільмаў, накіраваных на маральнае і эстэтычнае выхаванне гледачоў.

Міжнародны дзень адмовы ад курэння. Праводзіцца ў трэці чацвер лістапада ў многіх краінах свету па ініцыятыве Міжнароднага таварыства анколагаў пры падтрымцы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Упершыню быў устаноўлены Амерыканскім анкалагічным таварыствам у 1977 годзе.

1917 год — савецкі ўрад абвясціў «Дэкларацыю правоў народаў» — адзін з першых і найважнейшых актаў савецкай улады, які вызначыў асноўныя напрамкі нацыянальнай палітыкі савецкай дзяржавы.

Декларація правъ народовъ Россіи

1934 год — у СССР адбылася першая гукавая тэлеперадача. Перадача выявы на адлегласць была даўняй марай чалавецтва. Два дасягненні — кіно («вялікі нямы») і радыё («вялікі невідзімка») — павінны былі злучыцца, каб паўстала тэлебачанне. Доўжылася праграма 25 хвілін і ўяўляла сабой эстрадны канцэрт. Знакаміты артыст І. М. Масквін прачытаў апавяданне А. П. Чэхава «Зламыснік», затым выступілі спявачка і балетная пара. Так пачалося рэгулярнае гукавое тэлевяшчанне ў СССР.

1988 год — у Савецкім Саюзе праведзены паспяховыя выпрабаванні ўніверсальнай ракетна-транспартнай сістэмы «Энергія» з арбітальным караблём шматразовага выкарыстання «Буран».

УСМІХНЕМСЯ

Прыгледзела сабе будучага мужа.

Падкажыце, куды падзець яго жонку?..

— А гэта ў вас што такое?
— Трэнажор для сну.
— У якім сэнсе?
— У сэнсе — канапа.

У Адэскім універсітэце на экзамене па філасофіі прафесар задае студэнтам толькі адно пытанне: «Чаму?» Найвышэйшы бал атрымаў Яша. Ён адказаў: «А чаму б і не?»

— Мілы, сёння ў нас разгрузачны дзень...
— Дарагая, гэта як?
— У «Макдональдс» ідзём пешшу!

Выхаваны цешчай кот не толькі ходзіць ва ўнітаз, але і змывае за сабой. І яшчэ гучна гарлапаніць, калі хтосьці забывае гэта рабіць.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4167.
Нумар падпісаны ў 19.30 14 лістапада 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12